Цэна асобнагонумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 22 марца 1913 г. №. 12.

*Вільня, 21 марца.*

Пяруны вайны на Балканах заглушаюць нашэ штодзеннае жыцьцё. Мала хто цяпер цікавіцца што робіць Чацьвёртая Дума і якіе яна паперы перэбіраець.

Прабудзілася Дума і загудзела, вітаючы прэдседацеля боўгарскаго народнаго схода, калі ён заехаў у Думу. Балканскіе славяне хоць і цяжкімі ахвярамі, засьцілаючы дарогу галовамі лепшых сваіх сыноў, дабіліся да цёплаго Сіняго мора. Самые сьмелые, векамі вынашэнные ў сэрцы надзеі іх споўніліся, як дзіва якое, як сон. Боўгары, сэрбы і грэкі ведаюць, што яны гэта зрабілі ўсім народам і для ўсяго народу. Мы разумеем, чаму дэпутаты так горача віталі прэдстаўнікоў балканскіх славян: яны на ўсё іншае закрылі свае вочы, каб не глядзець кругом сябе, каб ня відзець штодзенных вудных спраў і варункоў, каб не выходзіло як у байцы Пушкіна: „вярнуўся старык да дому, перад ім землянка, а перад землянкай разбітае карыта“...

Расея, як сказаў нехта ў апаведаньні М. Горкаго, ёсць гасударства „уезднае“, ды яно ешчэ многа нацыональнае, дык тут мала завясьці лепшые парадкі. У жыцьці агульна гасударственным: трэба ешчэ здаволіць усе нації, свабоднае іх развіцьце, і так іх паставіць, каб яны трымаліся брацкім хаўрусам. Бо Расея—вялікая земля: цягнецца на многа тысяч вёрст. Што край, то звычай. Нават найбольшае племя—вялікарусы дзеляцьца на часці, а ўсе яны розняцца адна ад адвэй. Напрыклад, Пскоўская, Пецярбургская і другіе прыазёрные губэрні маюць іншы клімат, іншую культуру, нават іншаго гатунку скаціну, іншые будынкі, чым якая—небудзь курская, або тамбоўская губэрня; а на Доне саўсім ужо другі край.

Кожны край маець свае патрэбы—зусім асобные, каторые, седзючы ў Пецярбурзе, ня можва зразумець. Цяпер робяць нават з‘езды у асобных краёх, як у Дзьвінску ні даўна быў з‘езд хаўрусных таварыств з усяго Заходняго краю, бо тут варункі скрозь тые самые; а ўжо ў Сібіры саўсім другіе варункі: там сыбірскіе справы могуць разабраць толькі сібіракі на сваіх з‘ездах.

З развіцьцем грамадзянскаго і хаўруснаго жыцьця ўсё вырастаець патрэба рабіць краёвые з‘езды, каб разабрацца у інтэрэсах кожнаго краю. Гэта паказываець дарогу, якой Расея некалі пойдзе.

А. У.

## Не с таго канца.

Пытаньне аб змаганьні с хуліганствам (брыдкім свавольствам) усё ешчэ ня сходзіць з дзеннаго парадку. Развязываць гэтае пытаньне прабуюць земствы, гарадзкіе думы, адміністрація, міністэрствы. Трэцяя Гас. Дума гэтак сама патраціла німала часу над ім.

Саўсім зразумела, што і чацьвёртая Дума ні магла ні зацікавіцца гэтым пытаньнем. Да таго-ж чацьвёртай Думі патрэбны і такіе справы, каторые можна было б без канца прагледаць і да нічога ні дагледзіцца. У трэцяй Думе гэткай справай было «змаганьне с пьянствам» Чэлышова,—цяпер відаць гэту вакансію суджэна было заняць «змаганьню с хуліганствам». А дзеля таго, што найбольш пустых людзей ёсць сярод акцябрыстоў, то і цяпер у ролі спасацеля ад хуліганства выступае заслужэны акцябрыст, Шубінскій.

З яго пачыну акцябрысты падалі праект закону аб змаганьні с хуліганствам. Праект радзіць збольшыць кары за ўсякіе праступкі, завад‘яцтва, бойкі, лаянку, убіўства у бойцы, пагрозы і—за нідазволенае збіраньне ягад і грыбоў.

Ці ня дураць, адначэ, сябе і людзей усе тые, што афіціальна выступаюць цяпер барцамі с хуліганствам? Думаецца, што справа стаіць, акурат так, а не інакш. Ліцамерамі былі тые, што ў трэцяй Думе «змагаліся» с пьянствам—бо і самі яны добра ведалі, што пьянства ня зменшыцца датуль, пакуль даход ад прадажы гарэлкі будзе глаўнай падпорай у гасударстві. І гэткае самае ліцамерства—цяперэшняе змаганьне с хуліганствам пры помачы пабольшэных кар за «недазволенае збіраньне ягад і грыбоў».

Перш чым змагацца з якім колечы грамадзянскім, ці гасударственным недамаганьнем, трэба прыгледзіцца, з якіх прычын яно паўстало і чым падтрымліваецца. Гэтак робяць і лекары у часе якой небудь пошэсці яны лечуць хворых, але разам с тым і нават перш усяго шукаюць прычын з якіх пошэсць паўстала.

Якіе-ж прычыны выклікалі і выклікаюць сучасный страшэнный узрост хуліганства? Як раз на гэтае пытаньне ягомасць Шубінскі і тые, што з ім, ня здолеюць і ні захочуць выразна адказаць. А прычыны тые ясны для кожнаго справядліваго чэлавека, каторы уважна прыглядаўся да цяперэшняго народнаго жыцьця. Адначым толькі дзьве з гэтых прычын. Першая з іх—нідахват духоўнаго кіраўніцтва у шырокім народзе, — другая зямельные варункі, пры чорным бясудьзі, бо валасные суды адвучаюць людзей, ад справядлівасьці і веры у закон.

Што народу ні хапае цяпер моральнаго кіраўніцтва—гэта праўда сумная, але, німа што, найпраўдзівейшая. Даўней у ролі моральных кіраўнікоў народу выступало духавенства. Ці на добрае, ці на худое выкарыстывало духавенство сваю павагу—гэта іншае пытаньне, але досыць таго, што яно да вядомай меры стрымывало і затамовывало праявы нізкіх інстыктоў у народных массах. Цяпер павага духавенства у вачах народу упала і ні для кога ня сэкрэт, хто ў гэтым вінен. Духавенства, бадай пагалоўна заражэна вузкім матэрьялізмам і політыканствам (прыпомнім усе выбары у Думу), адшчапілося і адзялілося ад народу. Гэтак у нас на Беларусі духавенства змагаецца з натуральнымі народнымі вымогамі, што да роднай мовы у цэркві і касьцелі.

Калі-б на мейсцо духавенства станула якая небудзь іншая павага, хаця-б павага асьветы, культуры, нічогаб гэтаго не было-б. Але асьвета і культура па дарозі у вёску праходзіць праз розные «незалежные варункі», што і яе павага у вачах селянства падае.

Падаваць рады для змаганьня с прычынамі хуліганства было-бы цяпер па меншай меры дарэмнай працай: бо гэтых рад цяпер ні пачуюць тые, каму трэба было-б іх пачуць. Але можна і трэба падняць голас проці тэй пошэсці ліцамерства і пустаслоў’я, каторая пачынае шырыцца у звязку с пытаньнем аб змаганьні с хуліганствам. Хай бы хоць Гас. Дума ухілілася ад учасьця у гэтай камэдзіі. *Р.*

## Збыт лену.

Пасевы лёну для нашаго краю маюць вялікае значэньне, асабліва для селян. У шасьці паўночна-заходніх губэрнях, гэта значыць у Беларусі і Літве засеваецца лёнам у сярэднім 173 тысячы дзесяцін. З гэтаго чысла 128 тысяч дзесяцін засеваецца лёнам селянскай зямлі і толькі 45 тысяч дзесяцін дворнай. З гэтай зямлі збіраецца што году каля 5 мільёноў 200 тысяч пудоў валакна. Калі мы возьмем сярэднюю цану валакна па 4 рублі за пуд і накінем у прапорціі число грошы за семя, то пакажэцца, што у нашым краю выручаецца за прадукты лёну каля 30 мільёноў рублёў што году. Цыфры вельмі паважные.

Для многа якіх селянскіх гаспадарак, у тых мейсцох дзе разводзяць лён, лён пакрывае усе грашавые расходы селянскай гаспадаркі, а у арэндатарскіх гаспадарках вітэбскай, часьці віленскай і могілеўскай губэрні лён зазвычай пакрывае арэндную плату за зямлю. Пры гэтым трэба адмеціць, што лён сеюць толькі селяне, каторые могуць вырабіць яго сваімі рукамі (без наёмных), калі на дворных землях і сеецца лён, то тымі-ж

## З дневуніка пана Жылака.

**Запіскі С—го іграка.**

Пана Жылака знали ня толькі у нашых тутутэйшых закутках, але і далёка навокала. Гэта быў чэлавек, каторы аставіў ва ўсіх надоўга, каб ні сказаць на ўсё жыцьцё, памяць. Яго будуць памятаць і нашы і не нашы. Навіт такі чэрствы і шорсткі чэлавек, як наш крамнік Довід Рэзгін, і той ўздыхне і пачухае патыліцу усякі раз, калі хто успамяне імя нябошчыка. Праўда, наш вялікі знавець душы чэлавека, Гаронім Цыбаты, гаворыць, што ўздохі і пачухі патыліцы Довіда Рэзгіна маюць на гэта свае асобные прычыны: нябошчык пакінуў Довіду шмат неаплачэных квіткоў, бо меў звычай браць на павер. Але ні мае граніць людзкая злосць і лёгка кінуць чорную пляму на добрае імя чэлавека; ды і сам наш душавед, Цыбаты, не сыскаў з нябошчыка 7 руб. 35 кап., каторые той праграў яму у карты. Жылака хавалі з вялікім пыхам, а у вечэр таго дня яго сябры устроілі хаўтуры, і ўсю ноч звон чарак далёка нёсся поруч з душою нябошчыка, праводзячы яе туды, гдзе ужо спрадвеку прыгатавана ёй место і адкуль ужо ніколі ні знайдзе яна дарогі назад.

Я так патрэсен яго смерцьцю, што мой язык ня можэ сказаць і цені таго, што выяўляў собою нябошчык. Каб хоць крыху пазнаёміць вас з яго натураю, я скажу тут тые словы, каторые у вечэр былі казаны нашым прамоўцам Антосем Гладышом. Навярнуўшы на званковаго караля 10 кап. медзякамі, 10 срэбрамі падсунўшы ешчэ залатоўку пад жывот каралю «мазу» (якраз гралі у тэхталя). Антось Гладыш падпадняў шклянку піва, нахмурыў лоб, затуманіў вочы і сказаў:

„Панове! ці треба казаць вам, якога сябру згубілі мы, якую страту панесла наша кампанія? Гэта быў неутомны баец за „зялёным сталом“ Ен аддаваўся картам усей душою. Не задумываючыся праграваў ён грошы і усю пэнсію за цэльные месяцы ўперад. Ен гатоў быў праграць усё, пачынаючы сурдутом і канчаючы порткамі. Гэта была натура, каторая не любіла стыняцца на палавіні дарогі“... Шкада толькі, што наш прамовец ня скончыў сваю прамову: ніхто яго ня слухаў, кожны пазіраў на свае карты. А ў гэтым месьці мовы Антосевай як раз вышоў яго званковы кароль у чацьвёртым раду, і Антось Гладыш сам спыніў сябе, адвярнуўшы караля і гукнуўшы: «Руп соракі!»

Мяне бярэ крыўда за зневажэньне памяці нябошчыка. А мне хочэцца паказаць вам нябошчыка ва весь яго рост. Часта, як быў жыў, чытаў мне нябошчык свой днёўнік, куды ён запісываў усё, што было вартае увагі. Аднаму мне даверыў ён сваю тайну, тайну свайго пісьменства, і я не магу стрымацца, каб ні падзяліцца з вамі яго багатай спадчынай, адкуль вы самі убачыце, якая душа тулялася у яго нягеглым целе.

Вечны спакой табе! Ніхай будзе так лёгка табе земля, як была цяжка твая ігроцкая доля!

———

«Табе аднэй, мая кніжэчка, даверяю я маэ думкі радасць і горэ»,—так начынаецца днеўнік Жылака—„ты адна—мой лепшы друг. Нікому ні скажэш ты нічога, хоць на кожнай страніцы я пакінуў часць самога сябе. Эх!..“

*1 мая.*

Сягоньня я увесь дзень вясёлы. Цэлую ноч гралі ў карты у Г. Выграў 4 руб. 20 кап. Кладучыся спаць, я абмацаў ў камзэльцы тры рублі. Не памятаю, як яны там апыніліся. Усё роўна як знайшоў яна на вуліцы. З радасьці зайшоў до Пратаса і выпіў дзьве бутэлькі піва.

*2 мая*

Чытаў я, ня помню, калі і ня ведаю гдзе, як лісіца ухапіла курыцу. Вясёлая і давольная, падбегала яна да сваей нары. Але нагнаў яе каршун і выхапіў яе дабытак. Гэтак сягоньня здарылося і са мною: тое, што учора нагаблеваў, сягоньня спусьціў Тамашу—ды ешчэ і сваіх прылажыў пяць рублёў. Мне такі і не хацелося садзіцца, ўсё роўна як чуў. Але нагналі чэрці гэту акулу. Ну, што-ж? адыграюся! Дома перэмацаў ўсе кішэні: чэкай, браце Петра—будзем сыр есьці. Знайшоў адзін толькі медны траяк. Трэба адыграцца ды кінуць карты.

*3 мая.*

Доўга ня мог заснуць учора. А заплюшчыш вочы, от та і стаіць ў аччу Хрэставы ніжнік, вінная дзесятка і чырвенны кароль. Усю ноч сніліся карты, куча срэбра: Кажуць, сніць срэбро кепска: слёзы! Нёж я буду плакаць? І чаго бы? У Базыля здаецца, зьбіраецца кампа-

